# АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ ЛИНГВОДИДАКТИЧЕСКОЙ ПОДГОТОВКИ УЧИТЕЛЯ НАЧАЛЬНЫХ КЛАССОВ

## КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ ЯК УМОВА ЎДАСКАНАЛЕННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

*Андарала Г.Ф., кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,*
*Буцько М.А., кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт*

Анатацыя. У артыкуле разгледжаны пытанні маўленчай культуры як адной з састаўных камунікатыўнай культуры настаўніка пачатковых класаў, патрабаванні да яго прафесійнага маўлення, шляхі ўдасканалення камунікатыўна-маўленчых уменняў у студэнтаў факультэта пачатковай адукацыі ў працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова».

*Ключавыя словы: педагагічныя зносіны, настаўнік пачатковых класаў, камунікатыўная кампетэнтнасць, культура маўлення, працэс навучання.*

Сёння камунікатыўная культура настаўніка выступае вядучым фактарам і стрыжнёвым кампанентам педагагічнай прафесіі. Камунікатыўную культуру настаўніка мы вызначаем як асобасную характарыстыку, якая дае яму магчымасць аперыраваць лінгвістычнымі ведамі і ўменнямі ў розных сферах камунікацыі, у тым ліку ў сферы прафесійнай педагагічнай дзейнасці.

Камунікатыўная культура – гэта не прыроджаная здольнасць. Яна фарміруецца ва ўзаемадзеянні чалавека з сацыяльным асяроддзем. Асновы для фарміравання як агульнай культуры чалавека, так і яго камунікатыўнай культуры закладваюцца ўжо ў пачатковай школе. У гэтых умовах выключна важнае значэнне набывае камунікатыўная культура настаўніка пачатковых класаў. Як следства, адной з задач сістэмы падрыхтоўкі педагагічных кадраў з'яўляецца ўдасканаленне ў будучых настаўнікаў першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі камунікатыўнай культуры, якая садзейнічае больш прадуктыўнай педагагічнай дзейнасці.

Найважнейшым састаўным кампанентам камунікатыўнай культуры настаўніка, у тым ліку і настаўніка пачатковых класаў, з'яўляецца яго культура маўлення. Для настаўніка мова, маўленне – перш за ўсё рабочы інструмент, сродак данясення інфармацыі да дзяцей, а таксама сродак эмацыянальнага ўздзеяння на розум і пачуцці сваіх выхаванцаў, сродак фарміравання іх моўнай і маўленчай культуры. Асабліва гэта важна для настаўніка пачатковых класаў, паколькі ў дзяцей малодшага школьнага ўзросту вельмі высокі

аўтарытэт настаўніка, паводзіны, мову і маўленне якога яны капіруюць. Такім чынам, дасканалае валоданне культурай маўлення дазваляе настаўніку забяспечваць вырашэнне задач, якія складаюць сутнасць яго прафесійнай педагагічнай дзейнасці.

Пад культурай маўлення настаўніка пачатковай школы мы разумеем валоданне ім усімі відамі маўленчай дзейнасці і асновамі культуры вуснага і пісьмовага маўлення, уменнямі і навыкамі выкарыстання мовы ў розных сферах прафесійнай дзейнасці і сітуацыях педагагічных зносін – маўленчыя кантакты, звязаныя з сумеснай дзейнасцю настаўніка і вучняў, абмеркаванне праблем з бацькамі і калегамі, удзел і выступленні на педагагічных нарадах, паседжаннях і інш.

Культура маўлення ўяўляе сабой арганічнае адзінства самой мовы як сродку зносін і маўлення як спосабу яе рэалізацыі. Зыходзячы з адзінства гэтых кампанентаў да асноўных камунікатыўных прымет культуры маўлення правамерна аднесці:

– правільнасць маўлення. Гэта вызначальная прымета культуры маўлення. Правільнае маўленне магчыма толькі пры добрым веданні структуры мовы і ўменні падбіраць у кожнай канкрэтнай сітуацыі зносін найбольш дарэчны, стылістычна і экспрэсіўна апраўданы варыянт літаратурнай нормы; дакладнасць маўлення. Дакладным можна назваць такое маўленне, калі словы, якія ўжываюцца, поўнасцю адпавядаюць іх моўным значэнням – значэнням, што ўсталяваліся ў мове на дадзеным этапе яе развіцця; лагічнасць маўлення. Лагічнае маўленне фарміруецца на аснове навыкаў лагічнага мыслення, калі сэнсавая сувязь паміж словамі і сказамі адпавядае законам логікі; багацце маўлення. Індывідуальнае маўленне можа быць багатым або бедным, аднастайным або разнастайным. Развіццё і ўзбагачэнне яго залежыць ад авалодання моўным багаццем, засвоеным з вуснаў народа, твораў мастацкай літаратуры, з нарматыўнай граматыкі; чысціня маўлення. Чысціня маўлення цесна звязана з правільнасцю і нарматыўнасцю: калі ў маўленні няма парушэнняў лексічных і стылістычных, арфаэпічных і іншых норм, яно лічыцца чыстым; дарэчнасць маўлення. Дарэчным маўленне бывае толькі тады, калі яно вызначаецца правільнасцю, дакладнасцю, багаццем, чысцінёй.

Патэнцыяльныя магчымасці ў фарміраванні маўленчай культуры будучых настаўнікаў пачатковых класаў маюцца ў выкладчыкаў усіх без выключэння вучэбных дысцыплін.

Паспяховаму вырашэнню праблемы фарміравання культуры маўлення ў студэнтаў спрыяе вывучэнне імі дысцыпліны «Беларуская мова», якая прадугледжвае не толькі лінгвістычную падрыхтоўку, але і развіццё маўленчай сферы студэнтаў, фарміраванне іх прафесійных моўных і маўлен-

чых уменняў і навыкаў. Задача выкладчыка – узмацніць дзейнасны аспект у выкладанні дысцыпліны, сфарміраваць у студэнта прафесійныя камунікатыўна-маўленчыя ўменні для свабоднага і творчага карыстання мовай як педагагічным сродкам, узбагаціць прафесійны тэзаўрус студэнтаў. Адным з перспектыўных шляхоў удасканалення падрыхтоўкі будучых настаўнікаў з'яўляецца ўключэнне ў навучальны працэс актыўных форм і метадаў. Асаблівая роля сёння адводзіцца інтэрактыўнаму навучанню, пабудаванаму на ўзаемадзеянні, супрацоўніцтве, пошуку, дыялогу. Таму лекцыя-маналог уступае лекцыі-дыялогу, што дае магчымасць студэнтам засвойваць этычныя нормы маўлення, удасканальваць моўную культуру. Акрамя таго, студэнты набываюць вопыт вядзення прафесійнай палемікі.

Галоўнай і прадуктыўнай формай арганізацыі навучальнага працэсу з'яўляюцца практычныя заняткі, на якіх навучанне мове часта праводзіцца на камунікатыўнай аснове. Паколькі асноўнай камунікатыўнай адзінкай з'яўляецца тэкст, то тэкст выступае найвышэйшай адзінкай навучання. На базе тэксту вывучаецца лексіка, марфалогія, сінтаксіс, толькі на ўзроўні тэксту, у працэсе працы з ім можа быць сфарміравана і камунікатыўная кампетэнцыя ў будучых настаўнікаў пачатковых класаў.

Асноўным відам дзейнасці на практычных занятках выступаюць практыкаванні, якія змяшчаюць заданні на засваенне норм сучаснай беларускай літаратурнай мовы і практычнае авалоданне імі, правільнае выкарыстанне моўных адзінак адпаведна камунікатыўным мэтам, аналіз, узнаўленне, інтэрпрэтацыю і стварэнне тэкстаў прафесійнага накірунку, вусныя выказванні на разнастайныя тэмы школьнага жыцця.

Даволі эфектыўнымі з'яўляюцца заданні па стварэнні паўторных тэкстаў на аснове тэксту-арыгінала. Гэта пераказ параграфа дапаможніка, самастойная праца па дадатковых крыніцах, рэфераты, анатацыі, канспекты. Такая праца фарміруе навыкі вуснага і пісьмовага звязнага маўлення, актывізуе творчыя сілы студэнтаў. Яны вучацца складаць план і карыстацца ім, выбіраць з тэксту ключавыя словы і цэнтральныя сказы, развіваць, дэталізаваць выказванні, прыводзіць неабходныя прыклады для ўдакладнення выкладзенага матэрыялу.

Мэтазгодным з'яўляецца таксама выкананне заданняў на пераклад тэкстаў з рускай мовы на беларускую. Заўважым пры гэтым, што навучальны і дыдактычны матэрыял павінен падбірацца адпаведна будучай спецыяльнасці студэнтаў. Тэксты могуць змяшчаць інфармацыю аб прафесіі настаўніка пачатковых класаў, выдатных педагогах і метадыстах пачатковага навучання, навучальна-выхаваўчага працэсу, сучасных праблемах навучання і выхавання, культуры прафесійных зносін. Праца з перакладамі будзе спрыяць засваенню тэрмінаў абранай спецыяльнасці на фанетыка-арфаэпічным, лексіка-граматычным і стылістычным узроўнях, дасць магчымасць студэнтам назіраць за функцыянаваннем моўных адзінак.

У фарміраванні вуснага прафесійнага маўлення студэнтаў важнае значэнне набываюць вусныя выказванні па рэальнай прафесійнай праблеме. У выніку ствараецца маўленчая сітуацыя, якая натуральным чынам нараджае думку і патрабуе яе рэалізацыі ў маўленні. Такія выказванні, па-першае, выклікаюць зацікаўленасць студэнтаў, паколькі праблемы звязаны з іх будучай сферай дзейнасці, па-другое, спрыяюць актыўнаму і свядомаму засваенню тэрмінаў прафесіі настаўніка. Прадметам абмеркавання могуць быць такія тэмы, як гутарка настаўніка з вучнем пра невыкананне школьнікам сваіх абавязкаў, парушэнне ім дысцыпліны; правядзенне бацькоўскіх сходаў рознай тэматыкі; абмеркаванне дыскусійных пытанняў па прадмеце з калегамі; выступленне на метадычным аб'яднанні і інш.

Такім чынам, істотнымі, важнымі акцэнтамі ў выкладанні беларускай мовы ў сістэме падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых класаў у ВНУ з'яўляецца не толькі вывучэнне тэарэтычных пытанняў дысцыпліны, але і развіццё прафесійных моўных і маўленчых уменняў і навыкаў студэнтаў, фарміраванне іх камунікатыўна-маўленчых уменняў карыстацца мовай як педагагічным сродкам.

---

## ФОРМИРОВАНИЕ МЕТАПРЕДМЕТНЫХ УМЕНИЙ У УЧАЩИХСЯ III КЛАССА ПРИ ИЗУЧЕНИИ ФРАЗЕОЛОГИЗМОВ НА УРОКАХ РУССКОГО ЯЗЫКА

*Антонович Н.М., кандидат педагогических наук, доцент,*
*Добыш А.А.,*
*Белорусский государственный педагогический университет*
*имени Максима Танка, г. Минск*

Аннотация. В статье рассматриваются особенности формирования метапредметных умений у третьеклассников при изучении фразеологизмов на уроках русского языка. Предлагаются упражнения, направленные на овладение логическими действиями анализа, синтеза, сравнения, классификации и группировки, развитие умения устанавливать соответствие, прогнозировать цели учебной деятельности, осуществлять контроль и оценку деятельности, строить речевое высказывание.

*Ключевые слова: компетентностный подход, метапредметные умения, изучение фразеологизмов.*

В качестве одного из ведущих подходов на I ступени общего среднего образования является компетентностный подход, который «обусловлен социальными потребностями общества в компетентной, творческой личности с продуктивным типом мышления, способной к культурному саморазвитию, самостоятельному овладению знаниями и способами деятельности, решению конкретных проблем и задач в различных жизненных сферах» [1]. Он предполагает перенос акцента с процесса усвоения знаний на результат обученности учащихся.